Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 4. С. 102-106

*УДК 061.23(=162.1)(476.1)(091) «1907/1910»*

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ КЛЕЦКАГА АДДЗЕЛА НЯСВІЖСКАГА ПОЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА «АСВЯТА» Ў 1907–1910 гг.

**Д. У. Лішай,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ*

*UDC 061.23(=162.1)(476.1)(091) «1907/1910»*

# FUNCTIONING OF KLETSK DEPARTMENT OF NIASVIZH POLISH COMRADESHIP "ASVYATA" IN 1907–1910

**D. Lishai,**
*Postgraduate Student of the Department of Modern and Contemporary Times, BSU*

Паступіў у рэдакцыю 14.04.22.

Received on 14.04.22

У артыкуле даецца агульная характарыстыка дзейнасці Клецкага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1907–1910 гг. Адзначаецца актывізацыя прадстаўнікоў польскага руху ў сувязі з частковай лібералізацыяй урадавай палітыкі ў дачыненні да грамадскіх аб'яднанняў. Прыводзяцца факты выкарыстання арганізацыяй нелегальных форм працы з мэтай стварэння сеткі тайных польскіх школ у рэгіёне. Робіцца высновa, што апошняе стала галоўнай прычынай закрыцця расійскімі ўладамі як Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», так і яго Клецкага аддзела.

*Ключавыя словы:* Мінская губерня, Слуцкі павет, Клецкі аддзел «Асвята», польскі рух, легалізацыя грамадскіх аб'яднанняў, ліберальная палітыка расійскіх улад, тайныя польскія школы, антыўрадавая дзейнасць.

The article presents the general characteristic of activity of Kletsk department of Niasvizh Polish comradeship "Asvyata" in the territory of Minsk province in 1907-1910. It emphasizes the activization of representatives of Polish movement in connection with partial liberalization of government policy regarding public associations. It presents the facts of the organization's using of illegal forms of work for the purpose of creating a network of secret Polish schools in the region. The article draws a conclusion that the latter fact became the main reason of closure of both Niasvizh Polish comradeship "Asvyata" and its Kletsk department by the Russian government.

*Keywords:* Minsk province, Slutsk district, Kletsk department of "Asvyata", Polish movement, legalization of public associations, liberal policy of the Russian government, secret Polish schools, anti-government activity.

*Уводзіны.* У пачатку XX ст. на тэрыторыі Расійскай імперыі нацыянальныя супольнасці актыўна ўключыліся ў барацьбу за ўплыў у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурна-асветніцкім жыцці. Яна адбывалася на фоне частковай лібералізацыі ўрадавай палітыкі ў дачыненні да грамадскіх ініцыятыў. Прыкладам апошняга стаў указ імператара Мікалая II «О временных правилах об обществах и союзах» ад 4 сакавіка 1906 г. [1, с. 201–207]. Ён садзейнічаў спрашчэнню працэдуры афіцыйнай рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў. У беларускіх губернях прадстаўнікі польскай нацыянальнай супольнасці вырашылі выкарыстаць новыя нормы дзеючага заканадаўства для рэалізацыі сваіх планаў. Частка мясцовых прадстаўнікоў польскага руху адмовілася ад ідэі ўзброенага выступлення супраць расійскіх улад, якое было характэрна ў перыяд паўстання 1863–1864 гг., на карысць магчымасці легальнай працы. Нягледзячы на гэта, мясцовыя адміністрацыі працягвалі строга кантраляваць функцыянаванне аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей, адным з якіх з'яўлялася Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята».

Варта адзначыць, што заяўленая тэма не атрымала належнага асвятлення ў гістарыяграфіі. У працах беларускіх даследчыкаў А. Ф. Смалянчука [2, с. 163, 188; 3, с. 203], В. Матусевіч [4, с. 133, 135], А. В. Сяркова [5, с. 120], В. А. Быля [6, с. 47–48], а таксама польскіх гісторыкаў Д. Тарасюка [7, s. 37–40], П. Дамброўскага [8, s. 133], А. Раманоўскага [9, s. 389–340] даецца агульная і сціслая характарыстыка дзейнасці Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» на тэрыторыі Мінскай губерні, а аналіз функцыянавання ў рэгіёне асобных аддзелаў гэтай арганізацыі амаль адсутнічае. Таму актуальнасць узнятага пытання відавочная. Мэтай артыкула з'яўляецца разгляд функцыянавання аднаго з структурных адзінак арганізацыі – Клецкага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1907–1910 гг.

Паўнавартаснае адлюстраванне заяўленай тэмы неабходна праводзіць на аснове архіўных крыніц. Так, у фондзе 22 «Мінская губернская

па земскіх і гарадскіх справах прысутнасць» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) захоўваюцца асобныя дакументы, якія прысвечаны гісторыі існавання Клецкага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» ў 1907–1910 гг. [10]. Гэта заявы, рапарты, праекты статута, журналы пасяджэнняў Мінскай губернскай па справах аб таварыствах прысутнасці, пратаколы паліцэйскіх аглядаў, спісы членаў арганізацыі, фінансава-ўліковая дакументацыя. Каштоўныя звесткі ўтрымліваюцца ў справаздачах адміністрацыі Мінскай губерні ў адрас Дэпартамента паліцыі Расійскай імперыі, што захоўваюцца ў справах з фонду 102 «Дэпартамент паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў» Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (далей – ДАРФ) [11–12]. Яны дазваляюць даволі падрабязна адлюстраваць стварэнне і дзейнасць аднаго з самых актыўных філіялаў арганізацыі.

*Асноўная частка.* У канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай пашырылася нелегальнае навучанне на польскай мове. Яго ініцыятарамі станавіліся актывісты польскага руху. У пачатку XX ст. адным з каардынатараў гэтага працэсу стала асобная арганізацыя – Польскае таварыства «Асвята». Базіруючыся на ідэях нацыянальна-дэмакратычнай плыні польскага грамадска-палітычнага руху, арганізацыя стала адыгрываць значную ролю ў прапагандзе польскасці на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў. Аддзелы таварыства «Асвята» функцыянавалі ў Віленскай, Кіеўскай, а таксама Мінскай губернях, дзе асобныя арганізацыі месціліся ў Мінску і Нясвіжы. Кожная з іх мела разгалінаваную структуру мясцовых аддзелаў. Арганізацыі планавалі пашырыць уплыў у культурна-асветніцкім жыцці рэгіёна [11, арк. 79; 13, арк. 8].

У снежні 1906 г. прадстаўнікі польскай супольнасці горада Нясвіжа звярнуліся з прашэннем да адміністрацыі Мінскай губерні, у якім абгрунтоўвалі неабходнасць дазволу афіцыйнай рэгістрацыі новай грамадскай арганізацыі – Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята». Праектам статута арганізацыі прадугледжвалася культурна-асветніцкая дзейнасць у асяроддзі польскага насельніцтва горада Нясвіжа, а таксама Слуцкага, Навагрудскага і Мінскага паветаў Мінскай губерні. У якасці задач вызначалася заснаванне школ, курсаў, бібліятэк, чытальняў, выплата стыпендый бедным навучэнцам, правядзенне дабрачынных акцый, творчых імпрэз [10, арк. 6, 8, 20].

У сувязі з намерамі таварыства распаўсюдзіць свой уплыў на значнай частцы тэрыторыі Мінскай губерні, унутраная структура аб’яднання пачала набываць больш разгалінаваны выгляд. У ліпені 1907 г. быў утвораны Клецкі аддзел Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» з цэнтрам у Клецку. Гэта працэдура прадугледжвалася § 43 статута аб’яднання. Арганізацыйны сход аддзела адбыўся 22 ліпеня 1907 г. На ім было абрана праўленне, у якое ўвайшло 8 членаў: старшыня – А. Г. Рэйтан, віцэ-старшыня – І. І. Піляўскі, казначэй – М. Ф. Яленская, сакратар – А. Г. Чарноцкая. Членамі праўлення сталі Т. Б. Бярновіч, А. Б. Лазінская, А. В. Мысліцкі, Э. К. Зартоцкая. 4 асобы былі абраны кандыдатамі ў члены праўлення [10, арк. 28–28 адв.]. Затым аддзел пастанавіў ажыццявіць выпіску газеты Zorza Wileńska. На думку расійскіх улад, галоўная мэта гэтага рашэння была прапаганда ідэй перыядычнага выдання [10, арк. 56]. Неабходна адзначыць, што супрацоўнікі віленскай газеты Zorza Wileńska адкрыта заяўлялі пра намеры пашыраць польскасць на беларуска-літоўскіх землях [14, s. 1–2]. А 21 кастрычніка 1907 г. аддзелам была ўзгоднена выпіска літаратуры з Варшавы і Мінска. На пералічаныя вышэй патрэбы выдаткоўвалася 184 руб. [10, арк. 56].

Са жніўня 1907 г. Клецкі аддзел Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» пачаў сваю актыўную дзейнасць у межах 2-га і 4-га станаў Слуцкага павета, якія адпавядалі Клецкаму, Мядзведзіцкаму, Ляхавіцкаму каталіцкім прыходам. Філіял таварыства заснаваў шэраг тайных польскіх школ. Ксёндз Клецкага касцёла В. Герасімовіч арганізаваў нелегальнае навучанне ў мястэчках Клецк, Мядзведзічы, Вяжэвічы, засценку Гідрынаўшчына. Ён жа дапамог сялянам рымска-каталіцкага веравызнання адкрыць школы ў вёсках Пашкоўцы, Крышылавічы, Смалянікі, Заастравечча, Салаўі. Намаганнямі ксяндза Пашкевіча паўстала нелегальная ўстанова ў чыгуначным пасёлку Ганцавічы. Тайныя польскія школы былі адкрыты «местною шляхтою» ў засценках Сакаляцічы, Зубялевічы, Акшыць, Хрыпкава. Дваранін А. Свіда, які кіраваў справамі ў маёнтках князёў Радзівілаў, спрыяў заснаванню тайных школ у маёнтках Радзівілімонты і Малева. З ініцыятывы мясцовага кіраўніка справамі А. Янкоўскага пачала працу нелегальная ўстанова ў маёнтку Туча [10, арк. 58–58 адв.].

Вынікі выкрыцця нелегальных навучальных устаноў былі адлюстраваны ў пратаколе прыстава 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскага. Клецкі аддзел Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» і раней падазраваўся ў садзейнічанні арганізацыі тайных школ для мясцовага насельніцтва. У якасці падстаў для такога меркавання падкрэслівалася набыццё вялікай колькасці польскамоўнай літаратуры, высокія заробкі настаўніцкага складу, сярод якіх былі спецыялісты з Вільні і Варшавы. Асобна адзначалася пра арэнду памяшканняў

для школьнай справы, ініцыятарамі якой выступалі члены «Асвяты» А. Ю. Свіда і ксёндз В. Герасімовіч [10, арк. 58 адв. – 59]. Па выніках разбіральніцтва прыстаў 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскі адзначыў наступнае: «Исключительною целью этого общества является достижение объединения местного польского общества на пространстве Слуцкого и Новогрудского уездов, и открытие польских школ грамоты для бесплатного в них обучения детей местных крестьян» [10, арк. 58].

Расійскімі ўладамі быў праведзены аналіз фінансавых расходаў Клецкага аддзела таварыства. Аказалася, што толькі ў 1907 г. каля 1400 руб. было выдаткавана на набыццё малітоўнікаў, якія ксёндз В. Герасімовіч перадаў прыхаджанам Мядзведзіцкага касцёла. Акрамя таго, па смеце на 1907–1908 гг. аддзелам было пералічана 150 руб. у агульны бюджэт Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», у 1908–1909 гг. – 128 руб. Гэтыя сумы прызначаліся для асветніцкай дзейнасці. Асаблівую ўвагу расійскіх улад прыцягнулі запланаваныя фінансавыя расходы Клецкага аддзела на 1910 г.: першае асігнаванне склала 200 руб., з якіх 150 руб. прызначаліся на набыццё кніг ў бібліятэку. Аднак пры Клецкім аддзеле не існавала бібліятэкі, што, па меркаванні прыстава 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскага, сведчыла пра фінансаванне тайных польскіх школ [10, арк. 59 адв. – 60].

Таксама расійскія ўлады вельмі зацікавіў адзін з фактаў буйного грашовага асігнавання, зробленага таварыствам. Згодна з кнігай расходаў, 25 мая 1908 г. з касы арганізацыі было выдадзена 250 руб. на імя віцэ-старшыні Клецкага аддзела «Асвяты» Э. К. Чарноцкай. Апошняя арандавала на гэтую суму асобны двухпакаёвы дом у селяніна Канановіча ў Клецку. Віцэ-старшыня запрасіла на працу дзвюх сясцёр Кеўліч у якасці настаўніц, забяспечыўшы іх кнігамі і падручнікамі на польскай мове. Колькасць вучэбнай літаратуры была разлічана на 80 навучэнцаў. Была знойдзена і мэбля для абсталявання класа школы. У лістападзе 1908 г. па факце выкрыцця тайнай установы прыстаў 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскі склаў пратакол, які пасля быў перададзены судоваму следчаму 3-га ўчастка Слуцкага павета. Але гэта не перашкодзіла арганізатарам працягнуць нелегальнае навучанне. Таму 5 сакавіка 1909 г. прыстаў М. І. Стракоўскі канфіскаваў падручнікі на польскай і рускай мовах, што захоўваліся ў тайнай школе, якую арганізавала Э. К. Чарноцкая. Акрамя таго, было знойдзена 112 вучнёўскіх сшыткаў і грыфельная дошка. Таксама меліся геаграфічныя карты з выявамі Еўропы і Амерыкі, подпісы да якіх былі складзены на польскай мове. Пасля апошняй акцыі ўлад школа мусіла спыніць сваё існаванне [10, арк. 55 адв., 57, 61–65, 91 адв.].

У снежні 1908 г. у склад Клецкага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» ўваходзілі наступныя асобы: старшыня А. Г. Рэйтан, віцэ-старшыня Э. К. Чарноцкая, казначэй М. Ф. Яленская, сакратар А. Г. Чарноцкая. Членамі Праўлення былі ксёндз В. Герасімовіч, Т. Б. Бярновіч, Ю. В. Бярновіч, А. Б. Лазінская, А. В. Мысліцкі, В. Р. Рымша, М. Мержаеўскі, І. Абуховіч, Г. Згаржэльскі, А. Сокал. І. Яблонскі. Адметна, што па кожным узгаданым вышэй члене таварыства афіцыйнымі ўладамі давалася станоўчая характарыстыка ў палітычным сэнсе [12, арк. 50, 54–54 адв.].

Мінскі губернатар Я. Я. Эрдэлі даручыў слуцкаму павятоваму спраўніку Э.-Г. Штрыкеру тэрмінова правесці 20 мая 1909 г. рэвізію справаводства ў Капыльскім і Клецкім аддзелах Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» [10, арк. 32]. Засноўваючыся на прадпісанні слуцкага павятовага спраўніка Э.-Г. Штрыкера ад 18 мая 1909 г. за № 316, 20 мая 1909 г. прыстаў 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскі ажыццявіў рэвізію справаводства Клецкага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята». Дакументы захоўваліся ў маёнтку Лецяшын Цімкавіцкай воласці Слуцкага павета. Абавязкі сакратар аддзела на той час выконвала А. Г. Чарноцкая. Паліцэйскі чыноўнік выявіў шэраг парушэнняў дзеючага заканадаўства пры вядзенні справаводства. Так, статут і спіс членаў філіяла (усяго 22 асобы) быў складзены на польскай мове. Таксама кнігі запісу абмеркаванняў Праўлення таварыства, пасяджэнняў аддзелаў, фінансава-ўліковая дакументацыя вяліся па-польску, да якіх дадаваліся пераклад на рускую мову [10, арк. 38–38 адв.].

Нягледзячы на выпраўленне парушэнняў пры вядзенні справаводства, на якія ўказвалася ў прадпісанні мінскага губернатара Я. Я. Эрдэлі ад 12 ліпеня 1909 г. за № 165, афіцыйныя ўлады працягвалі падазраваць членаў таварыства ў нядобранадзейнасці. Прыстаў 2-га стана Слуцкага павета М. І. Стракоўскі падкрэсліваў: «…Освята содержит в себе что-то незаконное и преступное, почему и открытая Эмилией Чарноцкой польская школа была не просветительным учреждением, а чисто политическим, воинствующим, назначенным для окаталичения и ополячения местных русских крестьян. А потому и признавая, что Клецкий отдел по своим тайным функциям, косвенно направленный к поощрению неразрешенных польских школ, является учреждением угрожающим общественной безопасности и потому подлежащем закрытию» [10, арк. 61 адв.– 62 адв.].

У жніўні 1909 г. склад праўлення Клецкага аддзела арганізацыі паменшыўся да 4 асоб. Так, пасаду старшыні заняў Л. Чарноцкі. Віцэ-старшынёй з'яўляўся А. В. Мысліцкі, які замяніў Э. К. Чарноцкую. Апошняя заўчасна памерла ў лютым 1909 г. Касірам была Ю. І. Мікуць, сакратаром – А. Г. Чарноцкая. У склад Назіральнага Савета ўваходзілі ксёндз В. Герасімовіч, Г. М. Загарульскі, С. Чарноцкая [12, арк. 31, 46–46 адв., 50, 54–54 адв.].

Расійся ўлады пільна сачылі за дзейнасцю арганізацый польскага таварыства «Асвята» у Віленскай, Кіеўскай, Мінскай губернях. Па выніках праверак былі выяўлены парушэнні дзеючага заканадаўства. Яшчэ ў лютым 1908 г. расійскія ўлады перайшлі да ўзмоцненай праверкі антыўрадавага зместу ў дзейнасці польскага таварыства «Асвята». У кастрычніку 1909 г. была спынена дзейнасць таварыства «Асвята» ў Мінску разам з яго аддзеламі [15, s. 667]. Апошнім аб'яднаннем падобнага кшталту заставалася таварыства ў Нясвіжы і яго аддзелы ў рэгіёне. Але ў снежні 1909 г. мінскі губернатар Я. Я. Эрдэлі ўзняў пытанне аб ліквідацыі згаданай вышэй арганізацыі. Тлумачылася гэта парушэннямі дзеючага заканадаўства, якія дапусціла Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята» і яго аддзелы. 17 снежня 1909 г. Мінская губернская па справах аб таварыствах прысутнасць пастанавіла закрыць Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята» з усімі яго структурнымі адзінкамі. У студзені 1910 г. адбыўся Ліквідацыйны сход таварыства, па выніках якога арганізацыя спыніла сваё існаванне. Падчас гэтага пасяджэння члены таварыства заслухалі справаздачу аб грашовых сумах, што засталіся ў касах філіялаў. На рахунку Клецкага аддзела таварыства мелася 7 руб. 18 кап. [10, арк. 63–65, 94–96 адв., 99–100, 11, арк. 102]. Пасля закрыцця Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» мінскі губернатар Я. Я. Эрдэлі ўсклаў на слуцкага павятовага спраўніка Э.-Г. Штрыкера абавязкі па наглядзе за тым, каб арганізацыя больш не аднаўляла сваёй дзейнасці [10, арк. 97–98 адв.].

*Заключэнне.* Такім чынам, на аснове не апублікаваных да гэтага часу архіўных крыніц даказваецца, што Клецкі аддзел Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» актыўна функцыянаваў на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1907–1910 гг. Варта канстатаваць, што гэта адбывалася на фоне лібералізацыі ўрадавай палітыкі Расійскай імперыі ў дачыненні да грамадскіх ініцыятыў, што паўплывала на развіццё польскага руху ў беларускіх губернях. Афіцыйна выступаючы на асветніцкіх пазіцыях Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», Клецкі філіял рэалізоўваў свае планы па стварэнні сеткі тайных польскіх школ. Яго члены засноўвалі нелегальныя ўстановы адукацыі, асігнавалі грашовыя сродкі, падбіралі настаўніцкія кадры, набывалі кнігі і газеты. Таксама падчас рэвізіі справаводства таварыства ў 1909 г. расійскія ўлады зафіксавалі наяўнасць парушэнняў дзеючага заканадаўства. Усе пералічаныя вышэй факты прывялі да забароны дзейнасці арганізацыі Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» і яго аддзела ў Клецку.


*Літаратура*

1. О временных правилах об Обществах и Союзах, 4 марта 1906 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 3-е: в 33 т. – СПб., 1906. – Т. 26. № 27479. – С. 201–207.
2. *Смалянчук, А. Ф.* Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг. / А. Ф. Смалянчук. – Гародня [Гродна] : Ратуша, 2000. – 202 с.
3. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – 2-е выд., дапрацаванае. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 404 с.
4. *Матусевич, О.* Польское общество «Освята» в Минске / О. Матусевич // Знакамітыя мінчане : Матэрыялы VI Беларуска-польскай навук. канф., Мінск, 9 лістап. 2005 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал. А. Вялікі [і інш.] ; навук. рэд. А. Вялікі і З. Вінніцкі. – Мінск, 2005. – С. 133–136.
5. *Сяркоў, А. В.* Палітыка мясцовай адміністрацыі ў дачыненні да польскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў у Беларусі ў 1905–1914 гг. / А. В. Сяркоў // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2014. – Вып. 9. – С. 115–128.

*References*

1. O vremennykh pravilakh ob Obshchestvakh i Soyuzakh, 4 marta 1906 g. // Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii. Sobr. 3-ye: v 33 t. – SPb., 1906. – T. 26. № 27479. – S. 201–207.
2. *Smaliančuk, A. F.* Paliaki Bielarusi i Litvy ŭ revaliucyi 1905–1907 hh. / A. F. Smaliančuk. – Harodnia [Hrodna] : Ratuša, 2000. – 202 s.
3. *Smaliančuk, A. F.* Pamiž krajovasciu i nacyjanaĺnaj idejaj. Poĺski ruch na bielaruskich i litoŭskich ziemliach, 1864 – liuty 1917 h. / A. F. Smaliančuk. – 2-je vyd., dapracavanaje. – SPb. : Nieŭski prasciah, 2004. – 404 s.
4. *Matusievič, O.* Poĺskoje obšjestvo «Osviata» v Minskie / O. Matusievič // Znakamityja minčanie : Materyjaly VI Bielaruska-poĺskaj navuk. kanf., Minsk, 9 listap. 2005 h. / Bielarus. dziarž. pied. un-t imia M. Tanka ; redkal. A. Vialiki [i inš.] ; navuk. red. A. Vialiki i Z. Vinnicki. – Minsk, 2005. – S. 133–136.
5. *Siarkoŭ, A. V.* Palityka miascovaj administracyi ŭ dačynienni da poĺskich kuĺturna-asvietnickich tavarystvaŭ u Bielarusi ŭ 1905–1914 hh. / A. V. Siarkoŭ // Pracy histaryčnaha fakuĺteta BDU : navuk. zb. / Bielarus. dziarž. un-t. – Minsk, 2014. – Vyp. 9. – S. 115–128.

6. *Быль, В. А.* «Mała Warszawka»: польскі нацыянальны рух у Нясвіжы / В. А. Быль // Acta Anniversaria : зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музеязапаведніка «Нясвіж» / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гісторыка-культурны музейзапаведнік «Нясвіж». – Нясвіж, 2015. – Т. 1. – С. 45–52.
7. *Tarasiuk, D.* Między nadzieją a niepokojem. Działalność społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918 / D. Tarasiuk. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2007. – 211 s.
8. *Dąbrowski, P.* Narodowa demokracja byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego: studium z zakresu myśli politycznej i działalności obozu narodowego na ziemiach litewskobiałoruskich w latach 1897–1918 / P. Dąbrowski. – Kraków : Księgarnia Akademicka, 2010. – 388 s.
9. *Romanowski, A.* Młoda Polska wileńska / A. Romanowski. – Kraków : Universitas, 1999. – 456 s.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 22. Воп. 1. Спр. 942.
11. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей – ДАРФ). – Ф. 102. Воп. 116. Спр. 170. 1907. 104 арк.
12. ДАРФ. – Ф. 102. Воп. 117. Спр. 40.ч.9. 1908. 68 арк.
13. ДАРФ. – Ф. 102. Воп. 118. Спр. 40.ч.9. 1909. 51 арк.
14. A. K. Do Czytelników // Zorza Wileńska. – 1905 (1906). –22 gru. (4 sty.). – S. 1–2.
15. Zamknięcie «Oświaty» w Mińsku Litewskim // Zorza Wileńska. – 1909. – 15(28).10. – S. 667.

6. *Byĺ, V. A.* «Mała Warszawka»: poĺski nacyjanaĺny ruch u Niasvižy / V. A. Byĺ // Acta Anniversaria : zbornik navukovych prac Nacyjanaĺnaha historyka-kuĺturnaha muziejazapaviednika «Niasviž» / Ministerstva kuĺtury Respubliki Bielaruś, Nacyjanaĺny historyka-kuĺturny muziej-zapaviednik «Niasviž». – Niasviž, 2015. – T. 1. – S. 45–52.
7. *Tarasiuk, D.* Między nadzieją a niepokojem. Działalność społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918 / D. Tarasiuk. – Lublin : Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2007. – 211 s.
8. *Dąbrowski, P.* Narodowa demokracja byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego: studium z zakresu myśli politycznej i działalności obozu narodowego na ziemiach litewskobiałoruskich w latach 1897–1918 / P. Dąbrowski. – Kraków : Księgarnia Akademicka, 2010. – 388 s.
9. *Ramanoŭski, A.* Mloda Polska vilienskaja / A. Ramanoŭski. – Kraków: Universitas, 1999. – 456 s.
10. Nacyjanaĺny histaryčny archiŭ Bielarusi (daliej – NHAB). – F. 22. Vop. 1. Spr. 942.
11. Dziaržaŭny archiŭ Rasijskaj Fiederacyi (daliej – DARF). – F. 102. Vop. 116. Spr. 170. 1907. 104 ark.
12. DARF. – F. 102. Vop. 117. Spr. 40.č.9. 1908. 68 ark.
13. DARF. – F. 102. Vop. 118. Spr. 40.č.9. 1909. 51 ark.
14. A. K. Do Czytelników // Zorza Wileńska. – 1905 (1906). – 22 gru. (4 sty.). – S. 1–2.
15. Zamknięcie «Oświaty» w Mińsku Litewskim // Zorza Wileńska. – 1909. – 15(28) paź. – S. 667.